ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 31 (1360) | НЯДЗЕЛЯ, 8-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

СЛУХАЙ, ЮНКОРЫЯ!
У аўторак, 10 лютага, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні газ. „Чырвоная Зьмена“
АДБУДЗЕЦЦА
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ НАРАДА ЮНКОРАЎ.
Пасьля нарады—колектыўны паход у кіно.
Рэдакцыя.

КОМСАМОЛ БССР НА СТЫКУ З КАПІТАЛІСТЫЧНЫМ СЬВЕТАМ БУДЗЕ ЦЬВЕРДА СТАЯЦЬ НА ВАРЦЕ ЗАВАЕЎ КАСТРЫЧНІКА

З прамовы сэкратара ЦК ЛКСМБ тав. Палякова на IX зьезьдзе УсеЛКСМ



Працуючы на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, на будаўніцтве новых фабрык і заводаў, організуючы і замацоўваючы новыя тысячы савгасаў і колгасаў, разгортваючы культурнае будаўніцтва, мы тым самым пад кіраўніцтвам партыі разьвязваем нацыянальную праблему. Доказам гэтага зьяўляецца БССР, якая знаходзіцца на стыку з капіталістычным сьветам, з фашысцкай Польшчай. Калі ўзяць наказчыкі посьпехаў, дасягнутыя на аснове барацьбы за лінію партыі, хаця-б у прамысловасьці, то мы маем наступныя даны: процант росту продукцыі прамысловасьці ў 5 разоў перавышае той рост, які быў у перадавых капіталістычных краінах у пэрыод іх росквіту. У 1928 годзе мы мелі 29.000 рабочых, а ў 1930 годзе, на аснове росту прамысловасьці мы маем 63.000 рабочых.

Адначасова з ростам прамысловасьці мы маем буйныя посьпехі ў перабудове сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад, у пытаньнях нацыянальна-культурнага будаўніцтва. БССР пачала летась адна з першых рэспублік Савецкага Саюзу, праводзіць абавязковае ўсеагульнае пачатковае навучаньне. Раней меркавалася пачаць усеагульнае навучаньне ў 1933 годзе. Фактычна ўсеагульнае навучаньне пачалі ў 1930 г. Гэтыя посьпехі былі дасягнуты пад кіраўніцтвам нашай комуністычнай партыі і пры братэрскай дапамозе пролетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу.

Вялікае месца ва ўсёй рабоце бязумоўна займаў комсамол. Комсамол сапраўды быў першым памочнікам партыі на ўсіх франтох барацьбы за прамысловасьць, за савгасы і колгасы, за нацыянальную па форме і пролетарскую па зьместу культуру, прымяняючы вопыт такіх перадавых пролетарскіх організацый як Масква, Ленінград, Украіна і інш.

ЛКСМБ, як частка ўсяго УсеЛКСМ прышоў к IX зьезду, у асноўным дабіўшыся павароту да гаспадарчых задач. Аднак, у нас ёсьць і рад слабых вучасткаў у рабоце.

У пытаньнях адукацыі і працы рабочай моладзі мы таксама дабіліся буйнейшых посьпехаў. Калі к 8 зьезду мы мелі 6 школ ФЗВ, то зараз маем 30 школ Тэхнікумаў было 30, зараз маем 62. Калі мы мелі 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы (а да рэвалюцыі ніводнай ня мелі), то зараз маем 13. Усё гэта гаворыць аб тым, што на фоне агульных посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва, актыўнага ўдзелу ў ім комсамольскай організацыі мы маем буйнейшыя посьпехі і па лініі адукацыі працоўнай моладзі на аснове правядзеньня правільнай нацыянальнай політыкі партыі.

Я хочу падзяліцца вопытам кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэту ЛКСМ Беларусі. Мы распрацоўваем план конкрэтных дзейных удзелу комсамолу на аснове партыйнай устаноўкі ў вядучых галінах гаспадаркі нашай рэспублікі: жывёлагадоўля і ільнаводства, аграрна тэхнічнай... электрофікацыя і яе топлівная база—торф.

Мы пачалі прыцягваць да работы спэцыялістых.

На аснове прапрацоўкі гэтых пастаноў у комсамольскіх організацыях мы прапрацоўваем лічбовыя даныя нашага гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Мы ўцягнулі ў гэтую справу шырокі нізавы комсамольскі актыў, радавых комсамольцаў і наладзілі конкрэтна вырашаць задачу дыферэнцыйнага кіраўніцтва. Мы распрацоўваем конкрэтныя мерапрыемствы ў рабоце комсамольскай організацыі на аснове грамадзкасьці нашай рэспублікі. Мы дабіліся посьпехаў на аснове барацьбы за лінію партыі, непрымірымай барацьбы з усялякага роду опортунізмам, з правай небясьпекай, як галоўнай. Трэба адзначыць вялікую заслугу ЦК комсамолу, які год таму назад даў установку нашай далейшай рабоце, таму, што на некаторых вучастках мелі месца вялікія політычныя прарывы, па ліквідацыі якіх мы працавалі. Мы ўшчэнт разьбілі тэорыі правых опортуністых Бутырскіх, Мінаевых, Целешавых, якія атакавалі лінію партыі ў пытаньнях разьвіцьця саюзу, якія гаварылі, што „мы топчамся на адным месцы“, што „комсамол не займаецца тымі задачамі, якія прадяўляе рэконструкцыйны пэрыод“ і што „комсамол у даны час займаецца лоўляю блох, не работай, перажывае крызіс і г. д.“.

У рабоце IX зьезду комсамолу вялікае політычнае значэньне мае пастаноўка спэцыяльнага складу аб удзеле комсамолу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Праз гэта, як і патрабавалася мы зможам больш мобілізаваць увагу на барацьбу з адхіленьнямі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Тав. Сталін на XVI партыйным зьезьдзе гаварыў: „Малюнак барацьбы з ухіламі ў партыі будзе няпоўны, калі мы не закранем маючыхся ў партыі ўхілаў у галіне нацыянальнага пытаньня.

Па першае,—ухіл к вялікарасійскаму шовінізму.

Падругое,—ухіл к мясцоваму нацыяналізму. Гэтыя ухілы не настолькі прыкметны і напорысты, як „левы“, альбо правы ўхіл. Іх можна было-б назваць „паўзучымі ўхіламі“. Гэта ня значыць, што яны ня існуюць. Не, яны існуюць і галоўнае растуць“.

Пры агульным абвастрэньні класавай барацьбы мы маем актывізацыю вялікадзяржаўнага шовінізму, які зьяўляецца асноўным тормазам ў правядзеньні правільнай нацыянальнай політыкі партыі. Сярод комсамольцаў Беларусі ёсьць некаторыя таварышы, якія не разумеюць: чаму гэта галоўнай небясьпекай зьяўляецца зараз вялікадзяржаўны шовінізм, у той час, калі ў нас выкрыта контррэволюцыйная група беларускіх нацыянал-дэмократаў. Падобныя разважаньні патрабуюць ад комсамольскай організацыі хутчэйшага праядзеньня ў жыцьцё рашэньняў XVI зьезду аб узмацненьні барацьбы з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай. Адначасна ні ў якай ступені мы ня можам паслабіць барацьбу з мясцовым нацыяналізмам, у прыватнасьці ў нашых умовах—з беларускім нацыяналізмам, які орыентуецца на буржуазны Захад, ставіць стаўку на самабытную культуру ў процівагу сусаснай пролетарскай культуры, ня бачыць класавай дыфэрэнцыяцыі на вёсцы; сярод беларусоў, моў, няма кулака, а кулакі маюцца толькі сярод іншых нацыянальнасьцяй.

Характэрна ўстаноўка беларускіх нацыянал-дэмократаў, гэтай контррэволюцыйнай швалі. Яна расшыфроўваецца адным з ідэолёгаў беларускіх нац-дэмократаў у паказаньнях ДПУ.

Лёсік гаворыць: „На Савецкую Беларусь няма чаго спадзявацца; нацыянальная політыка тут вядзецца толькі для формы, а ўсё сапраўднае беларускае прасьледуецца. Неабходна зьбіраць свае сілы кожнаму ў сваёй частцы Беларусі для барацьбы з бальшавізмам, які вядзе хітрую маскоўскую, русіфікатарскую політыку. Маскоўскаму бальшавізму няма сэнсу сур'ёзна падтрымліваць беларускі і украінскі нацыянальна-культурны рух. Гэта часовы манэўр. Наша нацыянальнае ратаваньне ў незалежнай беларускай рэспубліцы, хоць-бы ў сувязі з Польшчай, але не з Масквой“.

Вось якая ўстаноўка контррэволюцыйнай беларускай нац-дэмократыі. Гэта ад нашых організацый патрабуе пасіленьня барацьбы з мясцовым нацыяналізмам, ва ўсіх яго відах, сярод розных нацыянальнасьцяй.

Па-мойму, зьезд павінен прыняць рашэньні аб тым, што пропаганда нацыянал-опортунізму не сумяшчальна з прабываньнем у шэрагах комсамолу.

Напярэдадні зьезду комсамолу былі імкненьні з боку некаторых паасобных таварышоў узяць пад сумненьне політычную лінію ЦК комсамолу. Гэта свайго роду „левы загіб“, які аказвае дапамогу правым. Комсамол Беларусі гэтым імкненьням даў рашучы адпор.

Рашэньні зьезду падагуляць пройдзены шлях, намецяць вехі пасьпяховага прасоўваньня комсамолу ўперад на аснове барацьбы за лінію партыі. (Воплескі).

„БЛІЗІЦЦА ЧАС РАШУЧАЙ СУТЫЧКІ З СУСЬВЕТНЫМ КАПІТАЛІЗМАМ“

„IX зьезд УсеЛКСМ лічыць немагчымым прабываньне ў радох ЛКСМ людзей, што недаацэньваюць ваеннай небясьпекі і не праходзячых ваеннай вучобы, што не падрыхтоўваюць сябе да надыходзячых боек“

Будзем вывучаць вайсковую справу, узмацнім сувязь з Чырвонай арміяй!

На парозе 13 гадавіны

Набліжаецца 13 гадавіна Чырвонай арміі.

13-ю гадавіну мы сустракаем у абстаноўцы, калі „пагроза нападу ўсё больш і больш акрэсьлена навісае над намі“, калі пад пакровам пацыфізму і комэдыі „разброеньня“ скрываецца шалёная падрыхтоўка да вайны, сьвістапляска ўзброеньня і разгул мілітарызму, калі „будучая гіганцкая бойня галоўным чынам і ў першую чаргу рыхтуецца супраць нас“ (Варашылаў)

Краіна саветаў дзесяткі раз на справе давяла сваё бязьмежнае жаданьне міру і разбраеньня.

Але ў сьвятле растучай ненавісьці к краіне соцыялізму, у сьвятле падрыхтоўкі вайны і інтэрвэнцыі, мы ня можам кожны дзень, кожную гадзіну ня думаць аб узмацненьні нашых узброеных сіл.

Ліхаманкавае ўзброеньне імпэрыялістых пад шыльдай „мірнай“ балбатні Лігі Нацый ні ў якім разе ня можа нас супакоіць. Усе легенды аб „савецкім дэмпінгу“, „прымусовай працы“ яскрава гавораць за тое, што хаця мы усямерна імкнемся да міру, але заўжды павінны быць гатовымі даць адпор арміі інтэрвэнтаў.

Кожная лішняя тона чыгуна, кожная лішняя тона апалу—уклад у скарбніцу нашай абароны, а таму зусім зразумела, што пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, плянавых заданьняў узмацняе абароназдольнасьць нашай краіны.

Сваю 13 гадавіну Чырвоная армія сустракае добрым становішчам баявога ўзброеньня, політычным ростам байца, адданага генэральнай лініі партыі. У гэты дзень Чырвоная армія пакажа ўзоры сваёй працы.

Нам, комсамольскім організацыям заводаў, фабрык, колгасаў, саўгасаў, весак і установ, якія не ўваходзяць у шэрагі Чырвонай арміі, трэба да гадавіны нашай мужнай варты ўзмацніць сувязь з ёю, апраўдаць званьне шэфа, выканаць рашэньні X зьезду ЛКСМБ і IX зьезду УсеЛКСМ.

Гадавіну Чырвонай арміі трэба ўсямерна выкарыстаць для таго, каб узмацніць сувязь Чырвонай арміі з заводамі, фабрыкамі, саветамі, профсаюзамі, колгасамі, саўгасамі і МТС. Трэба дабіцца большага пролетарскага кіраўніцтва, перабудаваць шэфства пад знакам новых задач, не абмяжоўваючыся толькі ўрачыстымі абяцаньнямі.

Агляд шэфства комсамолу над Чырвонай арміяй—важнейшае зьвяно падрыхтоўкі да гадавіны.

„Гадавіна Чырвонай арміі павінна зноў і зноў мобілізаваць увагу працоўных усяе краіны да пытаньняў абароны. Трэба праглядзець ваенную работу ўсіх організацый, якія заклікаты служыць справе абароны. Работа Асовіяхэму, ОДР, Аўтодор павінна быць падпарадкавана самай жорсткай бальшавіцкай самакрытыцы. Гэтыя організацыі павінны яшчэ больш рашуча змагацца за якасьць сваёй працы“.

Да гадавіны яшчэ засталося каля двух тыдняў. Гэты час трэба максымальна выкарыстаць для ўзмацненьня баявой падрыхтоўкі і актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве.

Комсамол павінен вывучаць вайсковую справу. Узмацняючы фонд паветранага флёту грашовымі ўзносамі, ведаць „на зубок“ вінтоўку, кулямёт, каб у любую хвіліну мог замяніць рычаг машыны на курок стрэльбы.

Пры першым заклiку нашай партыі будзем гатовы стаць пад ружжо.

Ударныя імя Варашылава

ЧАШНІКІ. 7 (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).—У саўгасе Начаявічы організаваны дзьве ўдарныя брыгады імя Варашылава з 27 чалавек.

Брыгада сьвінароў узяла абавязацельства вырасьціць 12 сьвіней прыплоду замест 10 намечаных прамфінплянам.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ
Храпуновіч.

Каўкасзкаячырвона штандартная сабра ла каля 100 тыс. р.

ТЫФЛІС. 6. Па няпоўных вестках Каўказкая чырвоштандартная армія к дню 50-годзьдзя Наркомваенмора т. Варашылава сабрала на дырыжабль „Клім Варашылаў“ каля 100 т. руб.

250 руб. у фонд абароны краіны

МАГІЛЁЎ. (Па тэлеграфу ад нашага корэспондэнта).—Комсамольскі колектыў чыгункі Магілеўскага вузла ўносіць у фонд абароны краіны 250 рублёў і выклікае раённую Магілеўскую організацыю комсамолу.

Еўдасеў.

13.000 РУБЛЁЎ НА ДЫРЫЖАБЛЬ „КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ“

КІЕЎ. 6.—Юбілей тав. Варашылава працоўныя Кіеву адзначылі ўзмацненьнем абароназдольнасьці краіны саветаў. На сходзе электроарматурнага заводу рабочыя падпісаліся на 10.000 рублёў у фонд пабудовы дырыжабля „Клім Варашылаў“. На заводзе „Бальшавік“ рабочыя сабралі звыш 3.000 рублёў у фонд дырыжабля. Рабочыя хадайнічаюць перад ЦВК СССР аб узнагародзе тав. Варашылава ордэнам Чырвонай зоркі

ГУРАГАННЫ АГОНЬ
па перашкодах на шляху колектывізацы

Вычысьціць з колгасаў шкоднікаў, кулацка-варожы элемэнт, ачысьціць кіраўніцтва колгаса ад опортуністых, організаваць новы прыліў у колгасы, ударна весьці падрыхтоўку да вясеньня сяўбы, павысіць кіруючую ролю комсамолу ў колгасах—галоўная задача ячэйкі ЛКСМБ

Наверстаць прапушчанае

Перавыбары кіруючых органаў колгасаў маюць вялікае палітычнае значэньне. Ад таго наколькі мы ўдала падрыхтуем і правядзем гэту палітычную кампанію залежыць далейшая прападзольнасьць кіраўніцтва колгасу і праца колгасу ў цэлым.

Аднак, пасобныя комсамольскія ячэйкі і кіраўніцтва колгасаў не ўразумелі ўсёй палітычнай важнасьці і неабходнасьці разгортваньня шырокай масавай работы вакол справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў колгасах і бяздзейнічаюць.

Вось факты: У колгасе „Прамень Комуны" (Слуцкі раён) не праводзілася і не праводзіцца падрыхтоўчай работы да перавыбараў праўленьня. Гэта пытаньне яшчэ нават не абгаварвалася на агульным сходзе колгасьнікаў. Не мобілізавана ўвага колгасьнікаў на падрыхтоўку да перавыбараў на барацьбу з недахопамі ў працы.

Комсамольская ячэйка гэтага колгасу таксама праяўляе поўную бяздзейнасьць у падрыхтоўцы да перавыбараў праўленьня. На агульным сходзе ячэйкі была заслухана толькі інформацыя аб перавыбарах. А каб абгаварыць кандыдатуры ў новы склад праўленьня, выявіць лепшых ударнікаў з комсамольцаў і моладзі для таго каб, высунуць іх у склад новага праўленьня,—аб гэтым ячэйка яшчэ не падумала.

Трэба пакончыць з бяздзейнасьцю. Комсамольская ячэйка павінна разгарнуць шырокую падрыхтоўчую работу, падпарадкаваўшы яе задачам арганізацыі новага прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы, шырока популярызаваць сярод аднаасобнікаў гаспадарчыя дасягненьні колгасу, мобілізаваць масы колгасьнікаў для барацьбы з недахопамі ў працы колгасу, для ачысткі яго ад кулацка-варожых элемэнтаў, падрыхтаваць з лепшых ударнікаў комсамольцаў кандыдатуры ў новы склад праўленьня.

Колгасьнік

Ганебная бяздзейнасьць

Смалявіцкая комсамольская райорганізацыя зусім не клапоціцца аб перавыбарах кіруючых органаў колгасаў. Большасьць комсамольскіх ячэек яшчэ не абгаварвалі гэтага пытаньня.

Комсамольская ячэйка колгасу „Комсамольская Воля" лічыцца адной з лепшых ячэек раёну, але тут яна ганебна бяздзейнічае. Комсамольцы не праводзяць ніякай работы сярод колгасьнікаў. У час перавыбараў, уплыву комсамольскай ячэйкі зусім не адчувалася. Сакратар ячэйкі, Шуміловская Ніна, замест быць на перавыбарчым сходзе, выехала на два тыдні ў адпачынак, нікому не даручыўшы кіраўніцтва ячэйкай.

У колгасе „Пожня" таксама дрэнна вядзецца падрыхтоўка да перавыбараў праўленьня. Комсамольцы ў перавыбарах не ўдзельнічаюць.

Бяздзейнічаюць комсамольскія ячэйкі ў падрыхтоўцы колгасаў да вясеньняй пасеўкампаніі і іх спэцыялізацыі. Добрая палова комсамольскіх ячэек раёну пытаньня гэтага не абгаварыла, не наменіла плянаў сваёй работы.

Райком комсамолу павінен зараз-жа прыняць рашучыя меры, каб забясьпечыць актыўны ўдзел усёй комсамольскай організацыі ў правядзеньні справаздачнай-перавыбарчай кампаніі колгасаў і падрыхтоўцы іх да вясны.

Ар.

Рашэньні зъезду ператвараем у жыцьцё

Ячэйка ЛКСМБ колгасу „Пагранічны Маяк" (Борказіцкі раён за ленінскія дні дабілася значных посьпехаў у сваей работе:

Праведзены сходы колгасьнікаў і бядняцка серадняцкага сялянства па пытаньню аб колектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясновай пасеўкампаніі. У выніку 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступіла ў колгас.

Заключыла соц. умову з ячэйкай колгасу „Ясная Паляна" на лепшае і ўдарнае правядзеньне падрыхтоўкі да сяўбы.

22 студзеня правела конфэрэнцыю колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі сельсавету па абгаварваньню пытаньняў, зьвязаных з падрыхтоўкай да вясеньняй пасеўкампаніі. Падана тры заявы ў ЛКСМБ ад бядняцкай моладзі.

Сваю работу ячэйка праводзіць пад баявімі лозунгамі рашэньняў X зъезду ЛКСМБ, дабіваючыся іх поўнага ажыцьцяўленьня.

Зіноўеў

Опортуністычная недаацэнка

Сіроцінскі райком комсамолу не зьвяртае ўвагі на працу комсамольскіх ячэек колгасу. Райком бачыць толькі школьныя і савецкія ячэйкі і не цікавіцца працай колгасных ячэек. Дабейская ячэйка пры колгасе „Іскра" развальваецца, хаця ўсе яе члены колгасьнікі, былыя батракі і беднякі. Комсамольцы цікавяцца палітычнымі пытаньнямі, але самі не могуць іх прапрацоўваць, бо пяпісьменныя. Райком ім у гэтым не дапамагае. У працу комсамольцы не ўцягваюцца. У выніку комсамолец батрак-колгасьнік Масьлабоў адаў сакратару ячэйкі комсамольскі білет.

Практычнага кіраўніцтва з боку райкому няма. Калі-ні-калі прыедзе прадстаўнік райкому, ды пакрычыць. Але ад гэтага карысьці мала.

Брыгадзір



Сынкі і пасынкі Сіроцінскага РК

Палітасьветныя ўстановы бяздзейнічаюць

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўкампаніі ў Ленінскім сельсавеце, Слуцкага раёну, праходзіць па-ўдарнаму. Пляны пасеўкампаніі даведзены да колгасаў, вёсак і гаспадарак. Для правядзеньня масавай работы па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы і організацыі прыліву ў колгасы мобілізаваны вучні ШКМ і ўвесь калектыў настаўнікаў, якія па вёсках праводзяць работу. Брыгады вучняў ШКМ за першы дзень сваёй работы ў вёсцы ачысьцілі 100 пудоў аўса і дапамаглі раду колгасьнікаў абмалаціць яравое збожжа.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што культасьветныя ўстановы, як напр., ленінская хата-чытальня, не пераключылі сваёй работы на падрыхтоўку да вясеньняй пасеўкампаніі. У хаце-чытальні не праводзіцца ніякай палітвыхаваўчай работы, насьценгазэта не выдаецца з часу Кастрычнікаўскіх сьвят.

Райпалітасьветы павінен тэрмінова прыняць захады, каб перабудаваць работу палітасьветных установаў раёну, падпарадкаваўшы іх работу задачам пасьпяховага правядзеньня вясеньняй пасеўкампаніі.

Я. П. і Я. Х.

Комсамольцы—у хвасьце

Комсамольская ячэйка саўгасу Бухіцчы (Сямёнаўскі сельсавет, Вузьдзенскага раёну) адна на ўсім сельсавеце, але працы яе не адчуваецца. Перавыбарчая кампанія сельсаветаў прашла без удзелу ячэйкі. На працы ў саўгасе комсамольцы плятуцца ў хвасьце. З-за дрэннай працы ячэйка не расьце, тады як у саўгасе шмат батрацкае моладзі. Вузьдзенскаму райкому комсамолу і парт'ячэйцы сельсавету неабходна зьвярнуць увагу на працу ячэйкі.

Комсамолец

Бюрократы габінэтаў усё яшчэ абгаварваюць пляны

(Ад нашага спэцкора)

Колгас „Прогрэс" (в. Малінаўка) організаваўся год назад. За гэты час ён умацаваўся і вырас. Колгас паказаў узоры працоўнага энтузіязму, правёў пасьпяхова першую бальшавіцкую сяўбу і ўборачную кампанію.

Зараз колгас вельмі напружана рыхтуецца да сустрэчы другой бальшавіцкай вясны, каб падрыхтаваным выйсьці адзінакалгаснай магутнай лавінай на распрацоўку сакавітых колгасных палёў.

Колгас ужо канчае рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара, рыхтуе насеньне, сартуе і ачышчае яго. Рыхтуе ўгнаеньне.

Комсамольская ячэйка колгасу зусім маладая, яшчэ толькі організавана. Але энтузіязмам і працоўным запалам насычана ўся яе праца.

Усе комсамольцы заняты ў колгасе на адказьнейшых вучастках гаспадарчай працы: даглядаюць кароў, коняй, сьвіней. Яны ўвайшлі адказнымі брыгадзірамі ва ўдарныя брыгады, яны зьяўляюцца адказнымі на вучастках за вясеньнюю пасеўкампанію, яны лепшыя агітатары за колгаснае будаўніцтва, праваднікі культуры ў сялянскія масы. Комсамольцы ўсю сваю штодзённую працу падпарадкавалі комуністычным мэтодам ударніцтва і соцспаборніцтва.

Былы Астрашыцкі райколгассаюз прыслаў у колгас кантрольныя лічбы засеву яравога кліну ў вясеньнюю пасеўкампанію 1931 году. Але гэтыя лічбы складаліся габінэтным парадкам, без удзелу масы колгасьнікаў, дапусьціўшы шэраг грубейшым памылак і недакладнасьцяй.

Колгас сваім насеньнем можа засеяць: аўса—160 га, а лічбамі прадугледжваецца засеў 80 га, пшаніцы 15га,—даецца 10, грэчкі 10—даецца 3, і г. д. Гэты абураны выпадак сьведчыць аб праваапартуністычнай практыцы ў складаньні плянаў вясеньняй сяўбы.

Замест дапамогі колгасьнікам, гэтыя лічбы іх блытаюць.

У райколгасаўскіх габінэтах кантрольныя лічбы складаліся галавацапаві, накштал агранома Жаўнерыка, які пры складаньні пляну і распрацоўцы кантрольных лічбаў не цікавіліся вывучыць становішча колгасу. Насенныя фонды розных культур, забясьпечаньне недахапаючым насеньнем, штучным угнаеньнем, а таксама рабочаю сілай не ўлічваліся пры складаньні лічбаў.

Колгас ужо даўно зрабіў райколгассаюзу заяўку на штучнае ўгнаеньне: калійную соль, супэрфасфат, а таксама на насеньне, у чым колгас адчувае востры недахоп (сэрадэля, віка, лубін, насеньне для сілосных культур), але „мудрыя" райколгассаюзаўцы ўпарта маўчаць, чым наяўна дэпляпуюць усю работу колгасу па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Колгас не можа складаць сталага цьвёрдага пляну да таго часу, пакуль не будзе ведаць, што ў яго ёсьць і на што ён можа разьлічваць.

Колгас не мае агрономічнай дапамогі. Няма з кім параіцца якія культуры лепей сеяць, якія на якой зямлі.

Час ідзе, а бюрократы з райколгассаюзу ўсё яшчэ топчуцца на месцы, абгаварваюць „пляны", складаюць у габінэтах новыя, выступаючы гэтым па сутнасьці супроць тэмпаў, супроць плянаў вясеньняй сяўбы, што зьяўляецца нічым іншым, як правядзеньнем правага ухілу на практыцы.

Колгас чакае адказу на яго заяўку, што яму будзе адпушчана з насеньня і штучнага ўгнаеньня, каб ён змог наверстаць упушчанае і скласьці вытворчы плян працы.

Віт. Сідарук

Вёска Малінаўка
Колгас „Прогрэс"

Падрыхтоўкі да сяўбы няма

Пры саўгасе „Серп" (Сьміләві раён) комсамольская ячэйка праводзіць працы ні ў ячэйцы, сярод саўгаснай моладзі. За месяцы—ніводнага сходу ячэйкі. сумесны сход з бядн цка-серадн кай моладзьдзю комсамольцы зьявіліся.

Адсутнасьць дысцыпліны прыв ячэйку да таго, што ўсе пра дзіўшыя гаспадар-палітычныя к паніі і мерапрыемствы ёю не гаварваліся і комсамольцы аб іх ведалі.

Да другой бальшавіцкай вяс ячэйка не рыхтуецца. Партыйн ячэйка, ведаючы аб гэтым, нія крокаў не прымае. Патрэбен т міновы агляд працы комсамольс ячэйкі з боку РК ЛКСМБ з т каб час, што застаўся да сяў максымальна скарыстаць для гас дарчага ўмацненьня саўгасу і колгасаў, якія абслугоўваюцца яч кай.

З. Вясёлы

Ачысьціць колгасы ад кл сава-варожых элемэнта

У многія колгасы Случчыны п лез клясава-варожы элемэнт і вя падрыўную работу знутры. Падры тоўку да справаздачна-перавыб чай кампаніі кіруючых орга колгасаў гэты клясава-варожы э мэнт імкнецца скарыстаць для дз крэдытацыі колгасаў, для падры яго аўтарытэту ў вачох самых к гасьнікаў, бядняцка-серадняцкіх вёскі.

Вось факты:

Рахункавод колгасу „Батра каб скомпромэтыраваць колгас, складаньні гадовай справазда наўмысьля скрыў 30.000 рубл даходу ад гаспадаркі. Заработн плата колгасьнікам была зьніжа што выклікала з боку колгасьнік абурэньне. Клясава-варожы элемэ скарыстаў гэты факт для дыскрэд тацыі колгасу. Толькі дзякую пільнасьці батрацка-бядняцкіх колгасу, гэты ўчынак шкодніка б выкрыты.

У колгасе „Перамога" колга нік з заможнікаў, каб перашкодзі пасьпяховай падрыхтоўцы колга да вясеньняй сяўбы, палам часткі трыера, чым вывеў яго строю.

У колгасе „Бязьярховічы" з можная частка яго членаў прад рагатую жывёлу, каб падарва колгас.

Колгас „1-е мая" засьмечан к лакамі і нэпманамі, якіх у колга звыш 20 асоб. Усе яны пазбаўлен выбарчых правоў.

Неабходна зараз-жа ачысьці колгасы ад клясава-варожага эле мэнту. Партыйныя і комсамольскі ячэйкі гэтых колгасаў павінны вы карыстаць справаздачна-перавыбар чую кампанію каб правесьці гэту работу і ўзмацніць пролетарска кіраўніцтва колгасным рухам.

Прыбытак

Ганебная бяздзейнасьць н адказьнейшым фронце

Комсамольская ячэйка колгас „Бальшавік", Стара-Дарожскага раё ну не працуе. Сакратар ячэйкі, таксама і член бюро не кіруюц ячэйкай. Даўно не было сходаў. Праца па ўцягваньню колгасьнікаў у комса мол не праводзіцца, ячэйка не рась це. Да другой бальшавіцкай вясны ячэйка не рыхтуецца.

Л. Дубовы


РАШАЮЧЫ НАБОР РАШАЮЧАГА ГОДУ

Лютаўскі набор у ФЗВ павінен уліць тысячы новых падлеткаў у кузьні кадраў для социялістычнай прамысловасьці

Аддзел кадраў ВСНГБ, праводзячы опортуністычную практыку, паставіў пад пагрозай зрыву падрыхтоўку да лютаўскага набору

ЦКК РСІ павінна прыняць усе захады да таго, каб 1 сакавіка вучні новага набору прыступілі-б да вучобы

Комсамол павінен разгарнуць бальшавіцкую барацьбу за максімум



Выканаць максімум

Лютаўскі набор разьлічан на тое, аб кадры кваліфікаванай рабочай сілы павялічыць на 270 тысяч чал.

Гэта значыць, што комсомол уцягне у вытворчасьць розных галін народнай гаспадаркі 270 тыс. новых падлеткаў.

Нормы лютаўскага набору ў школы ФЗВ зьяўляюцца мінімальнымі

Спробы перагледзець нормы набору ў ФЗВ з тым, каб іх зьменшыць, павінны разглядацца як опортуністычная недааценка падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы для прамысловасьці.

Комсамол павінен паклапаціцца каб падрыхтоўчая работа да набору была безадкладна давед ена да канца. Разьвёрстка прыёму па тэрыторыяльных вытворчых адзінках, складаньне за вак прадпрыемствамі, складаньне онэрацыйных плянаў комплектаваньня школ, нормальныя вучотна-вытворчыя і бытавыя ўмовы для прымаемых падлеткаў, кантроль за падрыхтав насьцю прадпрыемстваў к прыёму вучняў і за капітальным будаўніцтвам школ ФЗВ—вось асноўныя рычагі, да якіх комсамол павінен прыкласьці свае сілы

У працэсе гэтай працы комсамол павінен завастрыць сваю увагу, каб выканаць асноўныя ўмовы набору: соцыяльны склад уцягваемай у ФЗВ моладзі, максымальнае ўцягнень не дзяўчат, піонэраў старэйшых узростаў, моладзі з нацыянальных меншасьцяй і сваечасовую організацыю мэдыцынскага агляду прымаемых у ФЗВ.

Адначасова павінна быць разгорнута падрыхтоўка да правядзеньня сяменьняга набору ў ФЗВ.

Лютаўскі набор, які праводзіцца перад пачаткам другога 10-годзьдзя існаваньня школ ФЗВ, павінен зьявіцца асноўным зьвяном у барацьбе за далейшыя бальшавіцкія тэмпы разьвіцьця ФЗВ, у справе разгортваньня ўсеагульнага профэсыйна-тэхнічнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня.

Сёньня мы зьмяшчаем матар'ял налёту юнкораўскіх брыгад на установы, якія кіруюць ФЗВ і ад якіх залежыць пасьпяховае выкананьне плянаў лютаўскага набору.

Аддзел кадраў ВСНГБ сваёй опортуністычнай практыкай пас авіў пад явяўную пагрозу зрыву правядзеньня лютаўскага набору. Дрэннае становішча ФЗВ выкарыстоўваецца як шыльда для та о, каб дамагчы я скарачэньня набору, браць стаўку на „вузкія“ месцы.

Віцебск сыгналізуе аб тым, што набору пагражае зрыў.

Мы ставім пытаньне перад ЦКК РСІ аб недапушчальнасьці такога правядзеньня і організацыі адказьнейшай справы, як набор у ФЗВ і падрыхтоўка кадраў для прамысловасьці.

Лічбы набору—мінімальныя.

Павінен быць выканан максімум.

„Урач дазволіў“

Добруская школа ФЗВ паперніклў знаходзіцца ў надзвычайна цяжкім становішчы.

У лістападзе ўсіх фабзайцаў перавялі у новы, зусім вільготны інтэрнат. Загадчык школы тав. Міраповіч сказаў, што „Урач дазволіў“. Вучні хвараюць і прапускаюць заняткі ў школе і на вытворчасьці.

Патрэбна зьвярнуць больш увагі на ФЗВ паперніклў.

Ляшчоў.

Лютаўскі набор—пад пагрозай зрыву

Рашуча ўдарыць па опортуністычнай практыцы аддзелу кадраў ВСНГБ

Згодна разьвёрсткі ВСНГ СССР, у школы ФЗВ БССР за час лютаўскага набору павінна быць прынята 2500 чалавек. З іх у школы ФЗВ 2000 і 500 чалавек у будвучы.

Падрыхтоўка да лютаўскага набору аддзела кадраў ВСНГ БССР праве ў зусім слаба. Яшчэ дагэтуль ня вызначаны кантрольныя лічбы для кожнага ФЗВ Зусім зразумела, што ніводзен з іх не разгарнуў патрэбнай падрыхтоўчай працы да набору.

Загадчык аддзелу кадраў ВСНГ сказаў што разьвёрстка лютаўскага набору ня можа быць выканана. Да гэта-ж трэба дадаць, што няма патрэбнага памяшканьня і абсталяваньня.

На пабудову памяшканьняў для ФЗВ адпушчана 900.000 рублёў: для Гомельскага будвучу—150.000 руб., для ФЗВ поліграфічнай прамысловасьці Мэнску—100 000 руб., ФЗВ тарпянікаў—100.000 руб., ФЗВ тэкстыльшчыкаў (Дубровна) —120.000 руб , ФЗВ гарбароў (Магілёў)—20 .000 руб., ФЗВ швейнікаў (віцебск)—10.000 руб., ФЗВ запалкавай прамысловасьці —190.000 руб.

Але ні адна пабудова ня будзе скончана да лютаўскага набору.

Настаўніцкімі кадрамі і інстуруктарамі школы ФЗВ у асноўным будуць забясьпечаны.

Вучні іншых набораў знаходзяцца таксама у надзвычайна дрэнных умовах У большасьці школ ФЗВ няма інтэрнатаў. Металяпрацоўчыя школы ФЗВ не забясьпечаны матар'ялам, практычная праца зрываецца. Прыходзіцца працаваць на 4 зьмены з-за малога памяшканьня.

З вышэйсказанага відаць, што опортуністычная стаўка на скарачаньне ФЗВ, а значыць —фактычнае скарачэньне размаху будаўніцтва ФЗВ з боку аддзелу кадраў ВСНГ, дала свае вынікі.

Раўняючыся на „вузкія“ месцы, імкнучыся прыстасаваць усю працу да гэтых „вузкіх“ месц, а не змагаючыся за іх зьнішчэньне, аддзел кадраў ВСНГ у сваёй штодзённай працы праводзіў яўна опортуністычную практыку. Гэта відаць ужо з таго, што зараз ФЗВ у такім дрэнным стане з таго, што наша прамысловасьць і ўся грамадзкасьць прышлі да набору не падрыхтаванымі.

Брыгада: Кокін, Мохсон і Грынштэйн.

ПА-БАЯВОМУ ПРАВЕСЬЦІ рашаючы набор рашаючага году

МАСКВА. На падставе пастановы трэцяй сэсіі ЦВК СССР 5 га скліканьня, ад 10 студзеня 1931 году, па дакладу а мерапрыемствах па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы для народнай гаспадаркі Саюзу ССР, НКП СССР пастанавіў чарговы лютаўскі набор у школы фабзавучу і масавых проф сій правесьці з акім разьлікам, каб не пазьней 1 сакавіка 1931 году пачаць заняткі ў школах.

Набор правесьці ня менш 270.000 чалавек з разьбіўкай да ведамства і організацыі. Унешнія органы павінны не пазьней 10 лютага 1931 году скласьці опэрацыйныя пляны комплектаваньня школ.

Подлеткі, перакіданыя з сельскіх мясцовасьцей (батракі) павінны накіроўвацца галоўным чынам, у школы чыгуначнага транспорту і ў школы якія знаходзяцца па-за прамысловых цэнтраў і буйных гарадоў. Для ўсіх подлеткаў, якія перакідаюцца з іншых раёнаў, органы працы павінны дабівацца, каб гаспадарчыя органы прадставілі ім інтэрнаты, харчы і г. д.

У школы павінны перш за ўсё прымацца дзеці рабочых, выхаванцы дзіцячых дамоў, дзеці інжынэрна-тэхнічных работнікаў, занятых у вытворчасьці і у будаўніцтве. Дзеці былых паліткатаржан і ссыльна-пасяленцаў, дзеці сталых рабочых саўгасаў, батракі, дзеці батракоў і дзеці членаў прамысловай коопэрацыі, якія працуюць у агульных майстэрнях, а потым дзеці служачых, колгасьнікаў, беднякоў і серадняком і індывідуальнага сэктару сельскай гаспадаркі, а пры недахопе асоб—дзеці коопэраваных саматужнікаў—адзіночак і іншых паўпралятарскіх пластоў насельніцтва.

У школы фабзавучу павінна быць прынята ў 1931 годзе ня менш 10 .000 батракоў. У першую чаргу органы працы павінны ўкомплектаваць школы цяжкой прамысловасьці і транспорту, а потым школы іншых галін народнай гаспадаркі

Органы працы павінны асабліва дбайна, лепшым соцыяльным складам укомплектаваць школы рашаючых галін прамысловасьці (металяпрамысловасьць, хэмічная, горная і г. д.) Дзеці асоб, якія належаць да соцыяльна-чужых элемэнтаў, ні ў якім разе не павінны дапушчацца ў школы фабзавучу.


Органы працы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на шырокае ўцягваньне ў школы дзяўчат, прыняўшы меры да павялічэньня устаноўленых НКП СССР мінімальных норм прыёму дзяўчат, з тым, каб дзяўчаты ў сярэднім складалі каля 50 проц. агульнай колькасьці прынятых.

НКП саюзных рэспублік і мясцовыя органы працы павінны дабіцца праз комсамольскія організацыі прыцягненьня ў школы магчыма большага ліку піонэраў старэйшых узростаў.

Для правядзеньня набору і падрыхтоўчых да яго мерапрыемстваў, пры НКП саюзных рэспублік і пры мясцовых органах працы павінны быць організаваны спэцыяльныя камісіі.

Ва ўсей рабоце па ўкомплектаваньню школ фабзавучу органы працы павінны апірацца на шырокую грамадзкасьць, прыцягваючы да практычнага правядзеньня неабходных мерапрыемстваў прафсаюзы і комсамольскія організацыі. (ТАСС)

Каля опортуністычных ножнаў



— Цiскай, братва!

У Віцебску бязьдзейнічаюць

Падрыхтоўка да лютаўскага набору ў ФЗВ па Віцебску праходзіць надзвычайна нездавальняюча. Набор у школы ФЗВ мэталістых і чыгуначнікаў зрываецца з-за опортуністычнай недааценкі гаспадарчымі організацыямі важнасьці гэтай справы.

Гарком комсамолу бязьдзейнічае.

РСІ павінна прыняць тэрміновыя захады.

Б. Кажухін

Менскаму Гарсавету

ДАЙЦЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ПРАЦЫ

Ужо год, як у Менску існуе школа-фабрыка ФЗВ Белшвэйаб'яднаньня імя КІМ'у. У гэтай школе ў сучасны момант навучаецца 700 вучняў, пры 150 асобах кіруючага і тэхнічнага пэрсоналу.

Становішча грамадзкіх організацый школы надзвычайна цяжкое, уся пастаноўка грамадзка-політычнага выхаваньня знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Галоўная прычына адсутнасьць памяшканьня. На прадпрыемстве, дзе працуе 850 чал., няма клюбу. І заўсёды, як толькі трэба правесьці сход (а гэта бывае часта), распачынаецца беганіна ў пошуках памяшканьня, бо памяшканьне фабрыкі амаль цалком скарыстана для патрэб школы (аўдыторыі, цэхі, склад і інш.).

Але ня ўвесь будынак фабрыкі-школы ёй аддадзены. На першым паверсе гэтага будынку зьмяшчаецца магазын МЦРК, які напалову пустуе. Плошчы гэтага магазыну якраз хапіла-б для школьнага клюбу: да таго-ж гэтая плошча належыць школе.

Выходзячы з неабходнасьці праводзіць у школе самую шырокую грамадзкую і культурную працу, увесь грамадзкі актыў зьвяртаецца да вас з просьбай зьвярнуць увагу на становішча грамадзкіх організацый ЦРК, пашырыць школьную плошчу, каб даць магчымасьць зрабіць там клюб.

Таксама зьвяртаемся да Менгаркому і ЦК ЛКСМБ з просьбай дапамагчы нам знайсьці выхад з сучаснага становішча.

Колектыў КСМ вучком



Опортуністычная жангляроўка

ВЫНІК ОПОРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ

ФЗВ краўцоў пры Вітшвэі існуе год.

Спачатку было разгорнута соц. спаборніцтва, узьнята на належную вышыню працоўная дысцыпліна, але другое паўгодзьдзе дало некаторае пагоршаньне. ФЗВ стаў здаваць свае позыцыі. За апошні час у школе выявілася шмат шовіністычных настрояў, былі вылазкі антысэмітаў і яўрэйскіх шовіністых.

Таксама дрэнна пастаўлена агульная праца школы. Нерацыянальнае скарыстаньне матар'ялу, непарадак у растаноўцы сіл,—усё гэта вельмі адбіваецца на кваліфікацыі вучняў.

Факты заціску самакрытыкі і ганеньне на юнкораў, слабое парткіраўніцтва,—вось малюнак становішча ФЗВ. Пры такіх варунках ФЗВ ня будзе здольным уцягнуць у працу новыя кадры фабзавучнікаў, якія павінны ўліцца ў прамысловасьць за час лютаўскага набору.

Сучаснае становішча школы—вынік опортуністычнай практыкі і недааценкі ФЗВ.

Школа ФЗВ краўцоў павінна быць аздароўлена. Гарком комсамолу павінен безадкладна заняцца праверкай становішча ФЗВ і правядзеньнем лютаўскага набору.

Ляк.

У стане бяспрытульнага

Вучні вэнтыляцыйнага цэху Будвучу і Белдзяржбуду жадаюць працаваць па-ўдарнаму, але адміністрацыя Будвучу і пабудоў перашкаджае.

Адміністрацыя Будвучу лічыць, што не абавязкі канчаюцца пасьля таго, як яна пасылае цэх на якую-небудзь пабудову.

Прыкладаў такіх адзесяі шмат. Можна прывесьці факт з працы цэху на пабудове Дзяржбанку. Там, дзе павінны праходзіць трубы па ветрапроваду, зрабілі электрычную праводку, а не можна зрабіць збоку. Цэх доўгі час стаяў без працы, пакуль перараблялі праводку.

Аб інтэнсыўнасьці працы гаворыць ня прыходзіцца. Усе клопаты майстра цэху, тав. Гобэрмана, зьнішчыць гэтыя перашкоды, застаюцца без выніку.

Набліжаецца будаўнічы сэзон. Адпаведныя органы павінны тэрмінова заняцца становішчам школы, каб яна здолела сустрэць сэзон падрыхтаванай.

Вучні. 17 подпісаў

Разьюшаная жандармэрыя страляе ў бяззбройных дэманстрантаў

Ад пабояў вар'яцеюць і паміраюць

Варшава, 6. У турэмнай больніцы ў Новым Торгу памёр студэнт мэдыцынскага факультэту югаслаўскі грамадзянін Іво Корнэль, праляжаўшы ў больніцы тры гады пасьля зьбіеньня яго паліцэйскім у Кракаве. У выніку пабояў Корнэль доўга хварэў і звар'яцеў, ахоплены вострай формай маніі прасьледваньня.

Сьмерць Корнэля зрабіла вялікае ўражаньне ў сувязі з агульным становішчам ўнутры Польшы, якое ўчора было ахарактарызавана ў сэнаце адным з прамоўцаў наступным чынам: „за апошні час толькі чуеш у Польшчы, што зьбіваюць і б'юць;—б'юць на захадзе, б'юць на ўсходзе, амаль паўсюды б'юць".

ПОЛЬШЧА ШАЛЁНА ЎЗБРОЙВАЕЦЦА

Бэрлін, 5 „Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг" паведамляе, што ў Данцыгскі порт прыбылі з Швэцыі буйныя транспорты ваенных матар'ялаў выбуховых матэрый, прызначаных для польскага ваеннага міністэрства У лютым чакаецца прыбыцьцё новых транспартаў. За апошнія 14 дзён гэта ўжо трэці транспорт з ваеннымі матар'яламі, прыбыўшых ў Данцыг для міністэрства.

У „залатой" Амэрыцы паміраюць з голаду

Вашынгтон. 4 Пад усё ўзрастаючым націскам мас, у прыватнасьці, пад уражаньнем вядаўных галодных дэманстрацый, дэмократы і прогрэсыўныя рэспубліканцы патрабавалі вязначных асыгнаваньняў на аказаньне дапамогі насельніцтву. Дэмократычны сэнатор—Караўэй рэзка нападаў на Гувэра, заявіўшы, што Гувэр супроць аказаньня дапамогі, тады як штодзённа з голаду памірае 1.000 чалавек. Адказваючы, Гувэр працягваў адстойваць сваю позыцыю, заявіўшы, што дапамога з боку дзяржавы „падарве" ўпэўненасьць насельніцтва ва ўласных сілах і „паслабіць вопыт амэрыканскага характару".

Жандары штыхамі атакавалі дэманстрантаў

4 беспрацоўных забіты, 100 паранены

Прага, 5. 4 лютага ў шэрагу рабочых цэнтраў Богеміі паміж дэманстраваўшымі і беспрацоўнымі і жандармэрыяй адбыліся жорсткія сутычкі. У Эгеры ўваход у цэнтр гораду быў закрыты жандармэрыяй. Некалькі сот рабочых, аднак прарваліся ў горад і наладзілі дэманстрацыю. 15 рабочых былі арыштаваны. У Ашы на дэманстраваўшых 3000 беспрацоўных напалі жандары. Дэманстранты закідалі жандараў камяньнямі. Азьвярэлыя жандары накінуліся на іх і штыхамі ранілі больш 100 беспрацоўных. 57 рабочых арыштаваны.

Нават соцыял-фашысцкі друк вымушаны прызнаць, што у Духсе, дзе жандармэрыяй было забіта 4 беспрацоўных і 7 паранена, жандары адкрылі агонь без папярэджаньня. Со цыял-фашысцкая „Чэшскае слова" імкнулася апраўдаць дзеяньні жандараў і даходзіць да таго, што разглядае растрэл як прадпасылку для вырашэньня політычнага крызісу Чэха-Славакіі.

У парлямэнце прэм'ер Удржал заявіў, што жандармэрыя ўжыла зброю зусім законна. Пагражаючы комуністычнай фракцыі, Удржал заявіў, што Чэха-Славацкі ўрад не дапусьціць міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем. Удржал зрабіў у сваёй заяве рад анты-комуністычных выпадаў. Пасьля Удржала з радам паклёпніцкіх анты-комуністычных выпадаў выступіў соцыял-фашысцкі дэпутат Тамашак.

„Прызнаньне банкруцтва капіталістычнай сыстэмы"

Бэрлін. 5. Паседжаньне рэйхстагу 4-лютага было амаль цалком прысьвечана абгаварэньню ўнесеных комфракцыяй патрабаваньняў адмяніць дэкрэт аб дыктатарскім умяшаньні трацейскіх камісій у працоўныя конфлікты і запатрабаваньняў да ураду Брунінга зьнізіць зарплату. Ад імя комфракцыі выступіў дэпутат Шрэтэр, які ў сваёй прамове абсначаў патрабаваньне і запрос комфракцыі і прывёў цэлы рад выпадкаў. характарызуючых дэкрэт ураду, як зброі для аграбленьня зарплаты.

З адказнай прамовай Шрээру выступіў нямецкі міністар працы Штэгервальд, які адкрыта заявіў, што на сучаснай стадыі развіцця прыватна-капіталістычная грамада ня мае другога выхаду, акрамя скарачаньня выдаткаў на соцыяльныя патрэбы і зьніжэньня зарплаты. З лаўкі комфракцыі разгаліся ў адказ на гэтую заяву выкрыкі: „гэта прызнаньне банкруцтва капіталістычнай сыстэмы". Згодна прапановы народнай партыі галасаваньне комуністычных патрабаваньняў і запросу адкладзена.

Жандары стралялі ў бяззбройных дэманстрантаў

ПРАГА, 5.—4 лютага [illegible] абвешчаны ў паўднёва-заходняй Вэнгрыі днём беспрацоўных. Ва ўсіх рабочых цэнтрах адбыліся бурныя дэманстрацыі беспрацоўных, насуперак паліцэйскай забароне.

У Дуксе, у Ходаў, Ашы адбыліся крывавыя сутычкі паміж беспрацоўнымі і жандармэрыяй. У Дуксе жандары адкрылі агонь па дэманстрантах: 4 рабочых паранена і 7 забіта.

Міжнародная хроніка

—Аўстрыйская компартыя разгортвае работу па падрыхтоўцы міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем —25 лютага. У Вене і провінцыі адбываюцца мітынгі і сходы рабочых.

— Міжрабпом зьвярнуўся да ўсіх сваіх членаў з заклікам прыняць актыўнейшы ўдзел у правядзеньні міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя (25 лютага).

— Поль Бонкур (Францыя) перавыбраны старшынёю парлямацкай камісіі на замежных справах.

Горактыў Менскай арганізацыі адабрае бальшавіцкі[я] пастановы зьезду

Заўчора ў доме Камуністаў адбыўся сход актыву Менскай гарадзкой камсамольскай арганізацыі.

Сход заслухаў падрабязны даклад сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Шалякова аб выніках IX усесаюзнага і X усебеларускага зьездаў. У спрэчках па дакладу выказаліся т. т: Канопік („Комунар"), Каўпакоў (Гарком), Шэйн („Комунар"), Сухацкі („Кастрычнік"), Фрумкіна, Янковіч (гарком). Выступіўшыя ў спрэчках падкрэсьлівалі фактамі з працы ячэек колектываў правільнасьць пастаноў зьезду аб рабоце комсамолу ў пэрыод разгорнутага наступу соцыялізму.

Асаблівую ўвагу сход удзяліў пытаньню ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, вайсковага выхаваньня комсамолу і рабочае моладзі.

На выступіўшую ўдзельнікамі сходу прапанову пабудаваць комсамольскае зьвяно самалётаў адказу колектыў ф-кі „Кастрычнік"—уносіць 300 рублёў і выклікаць комсамольцаў ф-кі „Комунар" і „Энэргіі". Комсамольскі колектыў „Комунара" ўнёс 520 рублёў і выклікаў „Энэргію" і комсамол чыгункі.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму правадыру Чырвонай арміі Кліму Варашылаву.

ПАРАДАК

мобілізацыі актыву на ільназагатоўкі

У выкананьне пастановы Бюро ЦК ЛКСМБ аб ільназагатоўках мобілізаваць комсам. актыў з наступных пунктаў:

З Менску мобілізаваць 40 чал. якімі абслужыць раёны: Бягомльскі, Халопеніцкі, Крупскі, Плешчаніцкі, Лагойскі, Сьмілявіцкі, Барэзінскі, Чэрвеньскі, Пухавіцкі, Сьмілавіцкі, Вуздзенскі, Койданаўскі, Заслаўскі, Асіповіцкі, Стара-Дарожскі, Чырвона - Слабодзкі, Старобінскі, Любаньскі, Грэскі, Капыльскі, і Менскі прыгарадны савет.

З Воршы і Сель-гасп. Акадэміі мобілізаваць 36 чал., якімі абслужыць раёны: Аршанскі, Дубровенскі, Лядзянскі, Горацкі, Дрыбінскі, Расонскі, Мсьціслаўскі, Копыскі, Кругламскі, Талочынскі, Коханаўскі, Чарэйскі, Лепельскі. Хоцімскі, Касьцюковіцкі, Чэрыкаўскі, Крычаўскі, Крычаўскі;

З Магілеву мобілізаваць 20 чал., якімі абслужыць раёны: Магілеў, Лупалава, Чавусы, Прапойск, Журавічы Карма, Быхаў, Чачэвічы, Бялыніцкі, Шклоў.

З Віцебска мобілізаваць 2[illegible] чал., якімі абслужыць раёны: Віцебскі, Лёзьненскі, Высачанскі. Багушэўскі, Сенно, Бешанковіцкі, Сіроцінскі, Гарадоцкі, Межанскі, Сураскі, Вульскі;

З Полацку мобілізаваць 30 чал., якімі абслужыць раёны: Дрысенскі, Асьвейскі, Валынецкі, Ветрынскі, Вушачы, Полацак, Рассоны;

З Гомеля мобілізаваць 30 чал., якімі абслужыць раёны: Гомельскі, Цярахоўскі, Веткаўскі, Лоеўскі, Брагінскі, Камарынскі, Хойніцкі, Уваравіцкі, Буда-Кашалеўскі, Чачэрскі, Жыткавіцкі, Тураўскі, Петрыкаўскі, Юравіцкі, Лельчыцкі, Караліскі, Нараўлянскі;

З Бабруйску мобілізаваць 25 чал. якімі абслужыць раёны: Бабруйскі, Глускі, Клічаўскі, Парыцкі, Азарычскі, Сьвіслацкі.

Для дапамогі ў правядзеньні мобілізацыі і інструктаваньня актыву і на раённыя рабочыя брыгады паслаць упаўнаважанымі ЦК ЛКСМБ і Наркомзему наступных т.т.:

Рудніцкі—Менск. Дубаў—Віцебск, Пэрліна—Полацак, Юркянец-Скобло—Ворша, Старобінец,—Бабруйск, Шл[illegible]мін—Магілеў, Яцкевіч—Гомель.

Акрамя гэтага паслаць яшчэ 3 чал. для дапамогі раённым камітэтам: Вярбіцкі, Гельфан—Магілеў, Львовіч—Ворша, Драбінск—Полацак.

Прапанаваць Рэчыцкаму, Мазырскаму, Слуцкаму, Барысаўскаму, Клімавіцкаму, Жлобінскаму і Рогачоўскаму райкамолам ЛКСМБ мобілізаваць актыў для ўзмацненьня ільназагатовак па сваіх раёнах.

Пад асабістую адказнасьць сакратароў гарадзкіх—Менск, Гомель, Віцебск і раённых камітэтаў ЛКСМБ—Бабруйск, Магілеў, Ворша, Полацк—правесьці мобілізацыю па вышэйадзначанай разьвёрстцы і накіраваць у адпаведныя раёны не пазьней 10 лютага 1931 г.

Усе мобілізаваныя таварышы павінны быць у раёне да 25-II і абавязкова забясьпечыць да гэтага тэрміну поўнае выкананьне пляну ільназагатовак.

Час. вык. абав. адк. рэдактара— **С. АНІСА[...]**

Па эклектыках і шовіністых у музыцы—руйнуючы ўдар

I.

Як-жа практычна беларускі нацыянал-дэмократызм зьвіў сабе гняздо ў музыцы?

Конструкцыя і тэхнічнае выкананьне музычных рэчаў мае два віды: інструмантальны і вокальны.

Інструмантальны від музыкі складаецца з усіх радоў оркестраў і сольных інструмэнтаў (рояль, скрыпка і інш.), якімі выконваюцца музычныя рэчы. Гэты від музыкі, з удзелам і бяз удзелу слоў, толькі ў часе выкананьня музычных твораў дае сыстэму гукавых вобразаў і малюнкаў. Як мы паказалі ў тэорэтычнай частцы гэтага артыкулу,—сыстэма гукавых вобразаў заўсёды была і будзе (пакуль будуць клясы) клясавай псыхоідэолёгічнай напоўненасьцю. Тэорытычнае ўзуменьне соцыяльнага эквіваленту ў рэчах, напісаных для адзначанага віду музыкі патрабуе ад слухача і чытача знаёмства з асновамі ня толькі тэорыі музыкі, а і соцыялёгіі і псыхолёгіі клясы. Масавы чытач і слухач знаходзяцца на шляху аўладаньня ўсімі асновамі навукі і мастацтва на грунце політэхнізацыі нашых школ, а пакуль што возьмем другі від музыкі—вокальны, як прасьцейшы і найбольш даступны масаваму слухачу і чытачу.

Вокальны напрамак злучае ў сабе два віды музыкі: вокальны (харавыя, сольныя, сьпевы і г. д.) і інструмантальны (акомпанімэнт). Музыка і словы органічна між сабою зьвязаны. Дзе няма гэтага органічнага злучэньня, там няма мастацкасьці, там няма музыкі. Такія рэчы, пры самым найлепшым выкананьні іх, ня могуць зрабіць належнага ўплыву на слухача.

Калі адвойчы ўказалі на нац. дэмократызм у музыцы, композытар Шнітман голасна, выразна і ўсенародна заявіў: „У музыцы ня можа быць нацыянал-дэмократызму, а толькі можа быць дрэнная композыцыя рэчаў". Шнітман не такая вялікая расьліна ў музычным агародзе, каб на яговых творах высьвятляць проблему, якая нас цікавіць, але савецкая грамадзкасьць і ў яго творах („Паляці мая мысьль") убачыць тое, аб чым ідзе гутарка.

Пачнём з м у з ы ч н ы х віртуозаў і з таго „фундаманту нацыянальнай музыкі", на якім, па - Дрэйзіну, „пасьля рэволюцыі пачынаецца стварацца надбудова". Пачнем з надбудовы:

О, божа, спасе наш,
Ты міласьць нам пакажаш!
З няволі вызваль нас,
Збудзіў ты нас ужо раз.
Ты вочы нам адкрый
І сьвету нам пашлі
Ты праўду пакажы,
О, божа, спасе наш!

(Рагоўскі „Беларускія песьні для школ". Выд. пана Ластоўскага).

Больш:

„Край наш бедны, край наш родны... Ой, забыты богам край! Уцякаў бы, бег, здаецца, сам ня ведаеш куды.

Край наш родны! Бедна поле, ты глядзіш, як сірата, нудна ты, як наша доля, як ты наша цемната".

(Равенскі „Зборнік песень", стар. 17),

Яшчэ:

А як прыйду да хатанькі,
Дык жонцы—вяроўка;
А мне з панам разьбірацца
Ня будзе та лоўка.
Гу-га! гуга! загукаю,
Судзі-ж, божа, даждаць сьвята
Тады пагуляю.

(Анцаў і іншыя: Беларускія народныя песьні", стар. 21)

Замест клясавага змаганьня з панам, які зьдзекуецца над сялянамі,—містыка, зварот да бога, уцёкі з краю, трусасьць перад панам і „храбрасьць" перад жонкай. Замест клясавага ўсьведамленьня свайго соцыяльнага становішча—п'янства; замест колектыўнага выступленьня сялян супроць ката,—жальба адзін на другога перад сваім заклятым ворагам і ашуканцам:

„Любіў мяне барын, цяпер пакідае" (сялянам добра вядома любоў пана да сялянкі).

(Тэраўскі „Сьпеўнік", стар. 16).

„Пойдзем мы к пану, к пану жаліцца".

(Гарэцкі і Ягораў „Народныя песьні", стар. 145).

Пабачце, як „фундамант нацыянальнай песьні" вырашае жаночае і „выхаваўчае" пытаньне:

„Бі, сын, бі, дурную жонку бі,
Бі, навучай, на свой звычай
Пераварачай". (!!!)

(Ва ўсіх сьпеўніках усіх аўтароў: „Чалавек жонку б'е").

Далей:

[illegible] сьпіхнуў дзед бабку
З мосту ў ваду.
Цяпер, бабка, [illegible]айся,
Крыху пакупайс !
А што бабка ўзнырне,
То дзед ціем папхне.

(Ва ўсіх сьпеўніках „У месяцы верасьні).

С. Вязін.

(Працяг будзе).

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599